Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem

Беларускі Звон

Радыкальная тыднёвая часопіс

Цана асобнага нумару **20 гр.**

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
Вільня, Ліпоўка 18,
Адрэс для карэспандэнцыі і падпіскі: паштовая скрынка № 19.
Прыймо інтэрэсантаў
ад 10 да 2 гадз. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.
Падпіска з дастаўкай да хаты:
на 1 год—6 зл., за паўгоду—3 зл., за 3 мес. — 2 зл., за 1 мес.—50 гр.

Год I. | Вільня, 10 сакавіка 1931 г. | №. 5

Ня можна маўчаць...

Падзеі ў Савецкай Беларусі прынялі такі характар, што аб іх ня можна забывацца ні на адну мінуту.

Аб тым, што там творыцца, беларускае грамадзянства павінна ведаць нават у самых глухіх кутках нашай Бацькаўшчыны.

Але гэтага яшчэ мала.

Самыя шырокія слаі нашага селянства і працоўнай інтэлігенцыі мусяць выявіць свой голас у гэтай справе і моцна запратэставаць проці камуністычных зьдзекаў над нашаю культураю і нашаю нацыянальнаю ідэяй.

Пасьля ўсяго таго, што там сталася павінна быць кожнаму ясна, што камуністычны ўрад Усх. Беларусі ўзыйшоў на такі шлях, з якога няма ўжо павароту, выявіўшы зусім выразна сваё запраўднае абліччa ў адносінах да нацыянальнай нашай справы.

Там творацца цяпер такія рэчы, якія рэдка хто мог прадбачыць і якія аканчальна павінны выбіць грунт з пад ног людзей, пакладаючых свае надзеі на адраджэньне нашага народу, „арыентуючыся" на Камуністычны Менск.

Трэба ведаць, што за Камуністычным Менскам — стаіць Камуністычная Масква, якой Менск надпарадкаваны — а над усім гэтым стаіць Камінтэрн з яго праграмаю, нічога супольнага ня маючаю з нашымі нацыянальнымі ідэаламі.

Трэба быць такімі людзьмі, як паўцякаўшыя ў Саветы грамадаўцы Мятла, Рак-Міхайлоўскі і іншыя, каб да гэтага часу замыльваць добрым людзям вочы, даводзючы, што толькі апіраючыся на Савецкую Уладу можна тварыць нейкую беларускую справу.

Былі ўжо такія людзі, якія верылі ў падобныя шляхі, але разам з тым мы ведаем, які сумны лёс іх спаткаў.

Камуністычная ўлада не затрымалася нават перад арыштам выдатных сяброў Камуністычнае партыі, якім быў напр. праф. Ігнатоўскі, кончыўшы самагубствам у лёхах Менскай „чрэзвычайкі".

Арышт яго можна вытлумачыць толькі тым, што ён, будучы шчырым беларусам, хацеў тварыць беларускую культуру — і вось гэтая апошная акалічнасьць, і стала прычынаю такой трагічнай разьвязкі, аб якой мы ўжо ведаем з газэтаў.

Усё тое, што там творыцца яшчэ лішні раз сьцьвярджае правільнасьць нашага пагляду адносна тэй лініі, якую прынялі б. грамадаўцы апынуўшыся ў Саветах.

Сваёй прысутнасьцю там яны ўзмоцнілі антыбеларускі рух і шмат прычыняюцца да руйнуючай палітыкі камуністаў адносна ўсяго беларускага.

Гэта акалічнасьць павінна быць яснай для ўсяго нашага грамадзянства і яно павінна парваць усякую ідэолёгічную сувязь з усімі тымі, хто сваім фальшывым крокам — здрадзіў беларускай справе. А йначай, як здрадаю назваць гэтага ня можна. Каб выехаўшыя грамадаўцы былі запраўднымі барацьбітамі за нацыянальныя беларускія ідэалы — яны не ўзмацнялі-б варожага нам фронту. Магчыма згадзіцца і з тым, што тут у межах Польшчы, пры пэўных умовах ім не магчыма было застацца, але гэта яшчэ ня значыць, што было патрэбным выяжджаць у Саветы і падпарадкавацца камуністычнай партыі.

Сьвет шырокі і можна было выехаць у любы край, які-бы даў прытулак б. грамадаўцам, як палітычным эмігрантам.

Але яны сьвядома гэтага не зрабілі — і вось цяпер мы іх бачым у тым самым лягеры, які ў такі барбарскі спосаб душыць наш адраджэнскі рух. Гэтыя ўсе факты мы ня можам абыходзіць моўчкі і мусім сьмела правадзіць сваю думку ў самую гушчу нашага народу.

Наступіла пара, калі ён павінен прыступіць да пераацэнкі ўсіх вартасьцяў...

Сумнае зьявішча.

Весткі аб тых страшэнствах, якія пэражываюць беларусы пад уладай Саветаў, узварушылі ўсё беларускае грамадзянства ў Заходняй Беларусі. Найбольш чуткая на ўсякую крыўду моладзь беларуская ў асобе Беларускага Студэнцкага Саюзу першая адгукнулася на менскія падзеі і зьвярнулася да старэйшага грамадзянства, заклікаючы да ўчасьця ў пратэсьце. Б. С С. прасіў усе—бяз розьніцы палітычнага кірунку—беларускія арганізацыі і ўстановы прыслаць дэлегатаў на супольную нараду ў памяшчэньні Саюзу, як на тэрыторыі зусім нэўтральнай: бо Б.С.С. не належыць ані да аб'яднаньня беларускіх культ.-асьв. і гасп. арганізацый і устаноў (Цэнтрасаюзу), ані да аб'яднаньня хадэцкіх арганізацыяў і ўстаноў (гэтак-званага „Нацыянальнага Камітэту"). Цэнтрасаюз і аб'яднаныя ў ім арганізацыі і установы, разумеючы, што перад абліччам страшнае менскае трагедыі павінны хоць на мамэнт сьціхнуць усе нашы ўнутраныя сваркі і спрэчкі, а грамадзянства мусіць адзіным супольным фронтам даць адпор бальшавіцкаму тэрору ў БССР, прыйшлі на нараду; інакш аднесьліся да гэтага хадэкі, якія адмовіліся прыйсьці на нараду і толькі прыслалі свайго „наглядчыка" ў асобе гр. Пазьняка.

Сход у БСС, адбыты 21 лютага, пастанавіў выбраць тры асобы, якім даручыў зрабіць усё магчымае, каб выясьніць праўдзівасьць вестак аб самагубстве Ігнатоўскага і Купалы, а такжа каб зрабіць яшчэ адну спробу дабіцца супольнага выступленьня г.-зв. „Нацыянальнага Камітэту", дзе гуртуецца толькі невялікая лічба хадэцкіх арганізацыяў і ўстаноў. Выбраны былі грамадзяне: В. Грышкевіч, Бусел і Ст. Станкевіч. Перагаворы іх з „Нацкомам" не далі, аднак, памысных вынікаў: ксяндзоўска-ярэмічаўская група мела сьмеласьць заявіць, што іх „Нацком" зьяўляецца „агульна-нацыянальным" прадстаўніцтвам, дык ісьці з Цэнтрасаюзам, як з роўным, ня можа. „Нацком" сам выступіць з пратэстам, а другім ласкава дазваляе да гэтага пратэсту далучыцца.

Ясна, што выбраная сходам „тройка" не магла гэтае прапазіцыі прыняць, бо яна была спрэчна з дадзенай сходам інструкцыяй. Паўторны сход у Беларускім Студэнцкім Саюзе, адбыты 24 лютага, выслухаўшы справаздачу „тройкі", сьцьвердзіў злую волю „Нацкому", які хацеў проста выкарыстаць цяжкі мамэнт, пэражываны беларускім народам, каб хітрыкамі накінуць большасьці беларускага грамадзянства „правадырства" невялічкае групкі клерыкалаў з расейскім царкоўным дзеячом б. сэнатарам Багдановічам, на чале. Дзеля гэтага Цэнтрасаюз і не ўваходзячыя ані ў яго, ані ў „Нацком" арганізацыі (Беларускі Студэнцкі Саюз, Аб'яднаньне Беларускіх Жанчын імя „Цёткі", Белар. Выд. Т-ва) пастанавілі выступіць з пратэстам проці менскіх падзей самастойна і прынялі надрукаваны ў нас тэкст пратэсту.

Будучая вайна народаў.

Усё часьцей у прэсе зьяўляюцца весткі пра характар і разьмеры будучай міравой вайны, якая на думцы многіх палітыкаў выбухне рана ці позна.

Заслугоўвае на ўвагу нядаўна надрукаваная кніжка нямецкага стратэга, генэрала Людэндорфа над назовам „Вайна будзе весьціся на нямецкіх землях", у якой мы знаходзім шмат цікавых разважаньняў на гэтую тэму. Людэндорф у гэтай кніжцы паставіў пытаньне—„што-бы сталася, каб сёньняшняя Нямеччына ўпуталася ў міравую вайну" і дае на яе адказы, якія нічога пацяшаючага ня могудь даць для нямецкага народу.

Да разьвязаньня гэтага пытаньня ён падыходзіць з пункту гледжаньня вайсковага спэцыяліста-штабоўца.

Перадусім ён затрымоўваецца на ўкладзе сілаў у сучаснай Эўропе і бачыць у ёй два вялікія лягэры.

Награмаджаньне францускіх, бельгійскіх, польскіх і чэхаславацкіх вайсковых аддзелаў уздоўж нямецкай граніцы, па думцы Людэндорфа, зьяўляецца доказам офэнзыўных плянаў гэтых дзяржаваў.

Няма ніякай надзеі на тое, каб сучасная нямецкая армія магла ўстрымаць саюзныя арміі ад маршу іх па нямецкай тэрыторыі.

На 1 кілямэтр нямецкай граніцы — немцы могуць паставіць адзін аддзел кулямётаў—і больш нічога.

„Усе тыя забавы ў вайну—кажа Людэндорф —якія бачым у сябе—ня могуць скрыць сумнай праўды, што ў мінуту выбуху вайны — фармаваньне вайсковых аддзелаў было-б немагчымым".

Новыя нямецкія формацыі было-б можна толькі стварыць на тэрыторыі Італіі ці Савецкай Расеі.

Вера ў нейкія таямнічыя вынаходы, у нейкія „праменьні сьмерці" і газы — па думцы Людэндорфа — зьяўляюцца вераю наіўных людзей.

„Перад сьмяротнай павагаю вайны—„зьнікне ўся мітынговая фразэолёгія".

Адносна самых ваенных опэрацыяў — то Людэндорф зусім слушна кажа, што сягоньня коаліцыя будзе сьпяшыць як найхутчэй зламаць апор нямецкай арміі і ванясьці рашучы ўдар Італіі, пасьля чаго перакінуць свае сілы на помач Польшчы і Румыніі, і супольна з імі заатакаваць Савецкую Расею, раней, чым гэта апошняя зможа сабраць свае сілы.

Галоўная задачая Савецкай Расеі будзе палягаць на хутчэйшым разьбіцьці сілаў Польшчы і Румыніі з тым, каб хутчэй злучыцца з Нямеччынай, што між іншым будзе не такім лёгкім, як-бы хацелася немцам.

Як-бы там ня было, але савецкія сілы ў тых ці іншых пунктах сустрэнуцца з ваеннымі сіламі французаў, бэльгійцаў і іншых, якія прыдуць на помач Польшчы і Румыніі ў іх барацьбе з савецкай арміяй.

Трэба адзначыць тут, што Людэндорф памыляецца, калі кажа, што вайна будзе весьціся выключна на тэрыторыі Нямеччыны.

Яна будзе весьціся і то як раз у самых жорсткіх формах і на тэрыторыі Беларусі. Такі ўжо лёс нашай Бацькаўшчыны, што ні адна, здаецца, вайна не абмінула яе тэрыторыі...

Што датычыць вэнгерскай арміі, то яна будзе імкнуцца да злучэньня з італіянскаю, каб ратавацца ад офэнзывы Чэха-Славаччы.

Людэндорф нават кажа, што міравая вайна выбухне 1 траўня 1932 г. Ужо ўначы перад першым мабілізацыйным днём пачнецца паветраная і морская вайна і ўсе немецкія гарады будуць засыпаны бомбамі з самалётаў (газавымі, дынамітнымі і пажарнымі). Дзякуючы сучаснай ваеннай тэхніцы ня будзе розьніцы паміж фронтам і тылам.

Цывільнае жыхарства і нават жанчыны будуць сілаю фактаў уцягнены ў баявыя чыннасьці.

Людэндорф настолькі ясна ўяўляе сабе будучую вайну, што нават намечае пункты, дзе павінны адбыцца генэральныя бітвы.

Між іншым ён прадбачыць, што на 3-ці дзень па мабілізацыі чэскае войска займе Вену, і вэнгерская армія пакіне свой край.

Вельмі жорсткую барацьбу Людэндорф прадбачыць у раёне Сілезіі, у выніку якой немцы будуць пабіты і на 7-ы дзень усе немцы здольныя да вайны будуць інтэрнаваны ў Кракаве і Варшаве.

На 5-м тыдні вайны Людэндорф прадбачыць паражэньне італіянскай арміі, апэруючай у паўднёвай Нямеччыне, дзякуючы таму, што французы маюць лепшую ваенную тэхніку і будуць мець колькасную перавагу.

Паўднёвая Нямеччына, у выніку ваенных апэрацыяў, ператворыцца ў пустыню.

Адначасна з гэтым франка-бэльгійская армія займе паўночную частку Нямеччыны з Бэрлінам і пойдзе ў кірунку Памор'я.

„Бэрлін—кажа Людэндорф — будзе агульнай трупярняю".

Ясна, што пабіўшы Нямеччыну, Італію з Вэнгрыяй—саюзьнікі прыдуць з дапамогаю Польшчы, каб нанясьці аканчальны ўдар Чырвонай Савецкай арміі.

Людэндорф мае адвагу публічна асьцярагаць Нямеччыну перад тым, што можа даць ёй будучая вайна. Словы яго зьяўляюцца вельмі аўторытэтнымі, як дасьведчанага генэрала-стратэга і заслугоўваюць з нашага боку на вялікую ўвагу.

Палітычнае жыцьцё.

Польшча.

Справа перагляду Канстытуцыі ў Сойме.

3. III. у Сойме адбылося першае чытаньне ўнесенага клюбам ББ праекту новай канстытуцыі. Праект Б Б — той самы, які быў унесены гэтым клюбам яшчэ ў папярэдні Сойм—у пачатку 1929 г. Паводле гэтага праекту—улада прэзыдэнта мае быць такой, якой ня мае ўжо больш ані водны манарх у сучаснай Эўропе, а можа нават і ўваўсім цывілізаваным сьвеце, Польскі прэзыдэнт мае мець—ня толькі поўню выканаўчай улады і значную долю ўлады заканадаўчай, прытым—ня толькі права пачыну і „вэто" (спыну, забароны), але і пазытыўнай дэцызіі—міма і проці волі парляманту. Ён мае мець і значную долю нават і судовай улады, чаго, здаецца, даўно ўжо няма ў сьвеце канстытуцыйных дзяржаваў...

Дакладчык пас. Енджэевіч высьвятліў пагляд ББ на неабходнасьць такой рэформы сучаснай канстытуцыі, каб яна гарантавала сілу і трываласьць выканаўчай і вярхоўнай улады ў Польшчы, якая пастаўлена ў надзвычайна цяжкія геаграфічныя і міжнародавыя варункі існаваньня. Новая канстытуцыя павінна даць ураду магчымасьць—„з аднаго боку падтрымліваць карысную працу і добрую волю грамадзян, а з другога боку—выкараняць нялады, шкодніцтва, здраду і сілай прывадзіць да послуху варожыя дзяржаве элементы".

У пачаўшайся дыскусіі апазыцыя дала агульную крытыку праекту.

Прадстаўнік польскага аб'яднанага селянства закідаў ББ, што яго праект хоча ператварыць вольны й дзяржаўны народ Польскай Рэспублікі, які па канстытуцыі зьяўляецца адзіным уласьнікам вярхоўнай улады ў дзяржаве, у нейкую прыладу ў руках Прэзыдэнта, якога ўлада мае быць у запраўднасьці зусім неабмежана—бо-ж выразна неакрэсьлена канстытуцыяй. Да таго-ж Б Б клапаціцца, нажаль, ня тымі бедамі і клапотамі, ад якіх стогне й гіне цяпер насяленьне краю, а ў першую чаргу—селянства.—„Ніякая рэформа канстытуцыі ня вылечыць край ад гаспадарчага крызісу, пагражаючага яго насяленьню поўным заняпадам і катастрофай.

Пас. ББ Цар тлумачыў, што праект зусім не пазбаўляе шырокіх масаў народу права ўчасьця ў палітычным жыцьці і дзяржаўнай працы. Наадварот — гарантуе і тое й другое, не жадаючы ўводзіць ані дыктатуры, ані „цэзарызму".

Прадстаўнік эндэцыі таксама казаў аб несвоечаснасьці зьмены канстытуцыі, калі на карку дзяржаўнай улады ляжыць справа ратаваньня краю ад гаспадарчай катастрофы. Ён—проці таго, каб галаву дзяржавы выбіраў беспасрэдна ўвесь народ (а не заканадаўчыя палаты, як цяпер), дый каб у выбарах прымалі ўчасьце ўсе афіцэры арміі.

Прадстаўнік ППС кажа, што Польшча можа й будзе існаваць толькі як дэмакратычная дзяржава, а без парлямантарнага ладу няма дэмакратыі! Ня верыць ён у шчырасьць закліку збоку ББ шырокіх масаў народу да вольнага й роўнага ўчасьця ў палітычным жыцьці і дзяржаўнай працы ў Рэспубліцы. Аб „шчырасьці" гэтай, казаў ён, найлепш гавораць апошнія выбары і „Берасьць". Сойм, які маўчыць аб гэтых гвалтах, ня мае права перарабляць канстытуцыю.

Прадстаўнік хадэцыі закідаў праекту Б Б, што ён касуе канстытуцыйны падзел і незалежнасьць кожнай з асноўных дзяржаўных уладаў—заканадаўчай, выканаўчай і судовай, — замест якіх уводзіць як быццам пахаваныя ўжо гісторыяй „царокія ўказы" прэзыдэнта.

Пас. Голувко (ББ), лагодзячы сытуацыю, заклікаў апазіцыю да рачовай крытыкі праекту, каб супольнымі сіламі апрацаваць найлепшую канстытуцыю.

Прадстаўнік Украінска-Беларускага клюбу адкідае наагул бяз крытыкі ўвесь праект ББ, як высунены не начасе, калі трэба ратаваць увесь народ ад гаспадарчага заняпаду.

Выступае яшчэ рад аратараў, пасьля чаго праект—галасамі ББ—проці ўсей апазіцыі—перадаецца ў канстытуцыйную камісію—для падрабязнай апрацоўкі.

„Дзень безработных" у Польшчы.

Дзень 25 лютага быў, як ведама, назначаны згары Комінтэрнам на ўсім сьвеце, як „дзень безработных", для адпаведных „выступленьняў". Але толькі ў аднэй Нямеччыне ў гэты дзень адбылося шмат паважных сутычак камуністаў з паліцыяй і з іх „ворагамі-прыяцелямі"—гітлераўцамі. У іншых краінах — блізу ўсюды — „дзень безработных" прайшоў спакойна; і сілы камуністаў наагул аслаблі усюдых і паліцыя ўсюды прыняла меры. У Польшчы было таксама ціха.

Калі-ж урэшце зьбярэцца Праваслаўны Сабор у Польшчы.

Сьвяты сынод Прав. Царквы ў Польшчы — на апошняй сваей сэсіі, — заслухаўшы абшырны даклад мітрап. Дзяніса аб „усіх падрыхтаваўчых працах па скліканьні ўсепольскага Правасл. Сабору,—пастанавіў — прасіць мітрапаліта, каб ён прыняў усе залежныя ад яго меры дзеля прысьпяшэньня Сабору".

Цікаўна адзначыць, што той самы мітрапаліт Дзяніс за апошні час у сваей афіцыяльнай часопісі вядзе ўсьцяж вельмі вострую палеміку... проці самай „ідэі саборнасьці" ў правасл. царкве... Дык трэба думаць, што не сьпяшыць з Саборам хіба першы сам мітрапаліт... таму — ці „прысьпяшыць" ён... самога сябе, як просіць яго Сынод, вось у чым пытаньне!..

Заграніцай.

Новая „судовая" агіда Г. П. У. (Паказальны працэс меншавікоў у Маскве).

У Маскве Г. П. У. наладзіла чарговы „паказальны" працэс сацыялістаў-меншавікоў, якія вінавацяцца ў шкодніцтве і здрадзе. Характэрна, што ў гэтым „шкодніцтве" вінавацяцца і тры галоўных падсудных працэсу: Громан, Суханаў і Шэр, якія зьяўляюцца... галоўнымі творцамі слаўнай „пяцілеткі". Разабрацца чалавеку з здаровым розумам у ваўсім гэтым „ком-кавардаку" запраўды-ж ня лёгка.

Цяпер на лаўку падсудных пасаджаны не „белагвардзейцы" ці „інжынеры-сабатажнікі", прыяцелі замежных буржуяў-„капіталістаў", але старыя марксісты, якія зусім нядаўна былі сябрамі тэй самай партыі, якой кіравалі Ленін, Сталін і інш, І вось, іранічны „розум гісторыі", які дае спакойна камуністам рабіць свае недарэчныя, але страшэнна каштоўныя „спробы", каб усяму сьвету да канца паказаць у чым уся іх дурніна, цяпер адных „таварышоў зробіць катамі, а другіх — іх ахвярамі...

Няма чаго казаць аб тым, што ўсё абвінаваньне—выдумана ад пачатку да канца: усе „здраднікі" і „контр-рэвалюцыянэры" і „шкоднікі", апрацаваўшы „пяцілетні плян", якім так хваляюцца бальшавікі, дый якім яны маюць надзею „апярэдзіць і пабіць увесь капіталістычны сьвет Захаду", таксама шчыра працавалі й кіравалі гаспадарчым жыцьцём СССР, як беларускія дзеячы — нацыянальным у БССР. А калі „пяцілетка" неяк ня выконывалася, дык віна за гэта падае не на „шкодніцтва социял-здраднікаў", але на недарэчнасьць самой камуністычнай сыстэмы. Больш таго; якраз гэтыя больш разважныя, дасьледныя й асьвечаныя эканамісты, займаючы вышэйшыя й адказныя становішчы ў гаспадарча-фінансавым апараце ССР, рабілі ўсё магчымае, каб паралізаваць недарэчнасьць сыстэмы, стрымліваючы катастрафічнасьць сталінскага курсу. Але — якраз за гэта іх і пасадзілі сьпярша ў падвалы Г. П. У., а цяпер на лаўкі падсудных. Так рабілі і робяць камуністы з усімі, хто служыў ды служыць верай і праўдай Саветам, але хто хоча хаця крышачку кіравацца ўласным сумленьнем, розумам і навукай, ня слухаючы бязкрытычна й пакорна бязглуздых прыказаў Сталіна і яго Чэкі.

Новы ахвяры бальшавіцкага страху перад інтэрвэнцыяй вінавацяцца ў тым, быццам атрымлівалі грошы ад расейскіх меншавікоў, ад II Інтэрнацыяналу, ад расейскіх эміграптаў-прамыслоўцаў, нават... ад францускага генэральнага штабу! — за тое, каб за ўсялякую цану.., правалівалі „пяцілетку".

Адна за аднэй усе сацыял-дэмакратычныя партыі заходніх дзяржаваў выпусьцілі заявы, што ніякіх адносінаў з расейскімі меншавікамі ў ССР яны ня мелі. Але ж ці-ж гэта пераканае катаў!? Наадварот: толькі папсуе абарону падсудных. Найхарактэрней, што на працэсе самі падсудныя ўжо прызналі ўсе закіды пракурора, „прызнаўшыся" і ў „шкодніцтве", і ў „зносінах з расейскімі меншавікамі-эмігрантамі", і ў „гаспадарчым шпіонажу", і ў „здрадзе" і т. д. Г. П. У. пэўна-ж добра „падрыхтавала" усе гэтыя „прызнаньні" падсудных, зрабіўшы з іх запраўдныя „жывыя трупы"...

„Фон" новага чарговага працэсу зусім ясны, У насяленьні СССР усьцяж расьце ненавісьць да нячувана голае і галоднае, духоўна пустое, фізычна несьцярпімага жыцьця. Дык усьцяж трэба шукаць усё новых „ворагаў" і „шкоднікаў", каб цкуючы на іх народ, адводзіць яго гнеў ад запраўдных ворагаў і шкоднікаў вялізарнай але безабароннай краіны.

Ф. Акінчыц. Перадрук і пераклад забаронены.

На аграрныя тэмы.

(друкуецца, як дыскусыйны матэрыял).

(Працяг)

Нават некаторыя савецкія эканамісты змушаны былі прызнаць, што гэтакае дрэннае палажэньне беднаты ў многім павінна падзякаваць бязладзьдзю, якое панавала ў яе гаспадарцы, а яшчэ больш гультайству і прывычцы вясьці жыцьцё паразітаў. Пры новай эканамічнай палітыцы ніякага будаваньня сацыялізму на вёсцы мы ў сутнасьці таксама не назіраем, калі ня лічыць няўдалых экспэрымэнтаў з арганізацыяй камун, аб чым мы будзем казаць далей. Уся мэта гэтай палітыкі заключалася ў тым, каб спыніць анархію ў краі, якая магла пацягнуць за сабой згубу ўсяе дзяржавы, а з другога боку выцягнуць з вёскі, калі ня сілай, то хітрасьцю хаця-б такую колькасьць хлеба, якая-б не дала памёрці галоднай смерцю гарадзкому „гэгэмону".

Быў нават кінены лёзунг: „багацейце", той самы лёзунг, каторага так саромяцца цяпер тыя, хто яго кінуў. Думкі ўсяго савецкага апарату і Кампартыі былі далёкі ў той час ад пляновага сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы і былі зьвернены да больш прозаічных справаў—вывазу хлеба з вёскі і вышуканьня больш далікатнага спосабу эксплёатацыі асноўнага аб'екту камуністычнай палітыкі—селянскага насельніцтва.

Нават сама грашовая сыстэма была некаторы час збудавана на такіх дзіўных падставах, што ўсе яе ад'емныя бакі клаліся выключна на вясковае насельніцтва.

На вёсках ішлі т. зв. грашовыя знакі, каторыя заўсёды падалі ў цане, а ў гарадох сярод спэкулянтаў і нэпманаў вадзілася цьвёрдая валюта ў постаці чырвонцаў.

Націск на селянства, прыбраўшы іншыя формы—не аслабляўся, а выяўляўся ў розных постацях: у нізкіх цэнах на хлеб і нязьмерна высокіх на тавары гарадзкой прамысловасьці, прымусовых пазыках і г. д. Вынікі такой палітыкі для ўсяе сельскае гаспадаркі аказаліся такімі, якія і можна было прадбачыць, ня гледзячы на ўсю шуміху, паднятую навокал пытаньня аб павялічэньні пасяўной плошчы і давядзеньня яе да перадваенных нормаў. Гэтая плошча як і агульны збор хлеба ўпорчыва не падымаліся да гэтай нормы, аб чым найбольш красамоўна кажуць савецкія статыстычныя дадзеныя. Так напр. па вестках, прыведзеных Брыкам і пазычаных ім з Цэнтр. Смат. Упр., палажэньне справы ў гэтых адносінах выяўляецца ў наступным стане:

Пасеўная плошча збожжа па ўсім Саюзе перад вайной (у 1913 г.) раўнялася ў тысяч. дзясяц.—94.906, у 1925/26 г., яна падае да 79.050 і з гэтага часу пачынае падымацца, даходзячы ў 1927/28 г. да 86.928 тыс. дзес., але ўсёжткі не дасягнула перадваенных разьмераў.

Яшчэ менш спрыяючыя вынікі выяўляюцца пры падлічэньні агульнага збору збожжа па ўсім С. С. С. Р.

Аказваецца, што ў 1913/14 г. гэты сбор вызначаўся ў 5.122,3 міл. пуд., у 1925/26 — 4.420,4 міл. пуд. і ў 1927/28 — 4.433,1 міл. пуд.

Калі ўзяць дадзеныя, прыведзеныя тым-жа Брыке, якія адносяцца да агульнага збору пшаніцы па некаторых раёнах, — то малюнак будзе яшчэ больш яскравым пры параўнаньні лічбаў 1913/14 г. з дадзенымі за 1927/28 г.

А лічбы гэтыя такія.

Агульны збор пшаніцы ў міл. пуд.

	1913/14 г.	1927/28 г.
Украіна	440	372,7
Паўн. Каўказ	319,4	214
Крым	31	20,3
Ц. Чарн. Вобл.	50,1	21,3
Волжск. Кам.	16,1	5,2
Сяр. Волжск.	130,2	55,1
Урал	90,3	93,2
Казакстан	120,4	87,5
Д.В.К. Туранска-Мангольская і Якуцкая вобл.	21,6	24,8
Беларусь	13,1	15,2
Закаўказьзе	45,7	49
Узьбекстан і Туркестан .	41,9	32
Ніжня-Волжская	153,4	41,2
Сібір	105	202,7
Увесь С. С. С. Р.	1578,2	1234,2

Такім чынам амаль ува ўсіх вобласьцях С.С.С.Р. мы назіраем аграмадны ўпадак агульнага збору пшаніцы і толькі Сібір дала даволі значную надвыжку. У канцавым падсумываньні збор пшаніцы нават у самы разгар эпохі „нэпу" аказаўся значна меншым, чым у даваенныя часы.

„Разумная" аграрная палітыка кампартыі прывяла да таго, што край, які вывозіў у даваенныя часы хлеб, — цяпер сыстэматычна галадае. Палажэньне справы робіцца больш скамплікаваным, дзякуючы яшчэ і таму, што насельніцтва С. С. С. Р. хутка размнажаецца ў той самы час, як прадукцыя збожжа знаходзіцца на вельмі нізкім роўні і значна адстае ад росту насельніцтва.

На гэтае зьявішча зьвярнуў, між іншымі увагу Рыкаў. „Патрэба ў хлебе" – кажа ён:—узрастае хутчэй, чым расьце сельска-гаспадарчая вытворчасьць...

Кожны год прырост насельніцтва ў нас раўняецца насельніцтву двух такіх гарадоў, як Ленінград (3 міл. з лішкам). Калі параўняць павялічэньне насельніцтва С.С.С.Р. на эўрапэйскі маштаб, то мы маем кожны год прырост нашага насельніцтва ў памерах, роўных усяму насельніцтву Данія перавышаючы ўсё насельніцтва Нарвэгіі і прыблізна роўных ўсяму насельніцтву Швайцарыі", (Рыкаў „Індустрыялізацыя і хлеб". Выд. 1928 г. стар. 34).

А далей ён прызнае, што хаця „сельска

Зноў загаворы на савецкай Украіне.

Як падаюць апошнія газэты, — на Савецкай Украіне Г. П. У. напала быццам на сьлед вялікай украінскай арганізацыі, якая мела на мэце паваліць сучасны ўрад.

Загаворшчыкі мелі ў вайсковых аддзелах свае ячэйкі і вялі падгатоўку да вайсковага бунту і абвяшчэньне на Украіне вайсковай дыктатуры.

У сувязі з выкрыцьцём гэтага загавору праведзена шмат арыштаў сярод украінцаў. Між іншымі арыштаваны б. дырэктар Зах.-Украінскага ўраду Петрушэвіч, ген. Косак, якога бальшавікі перавязьлі ў Менск. Апрача гэтага арыштаваны праф. Ложынскі (паходзіць з Львова) і 30 студэнтаў. Найцікавейшае ў гэтай справе — дык гэта арышт галоўнага камандзіра Савецкай арміі на Далёкім Усходзе Блюхера, якога абвінавачаюць у загаворы.

Падаюць, што вайсковы бунт на Украіне меў быць сыгналам да рэвалюцыі ў Маскве.

Як відаць з усяго гэтага, палажэньне ў Савецкіх Рэспубліках назваць пэўным у ніякім выпадку ня можна...

Югаславія.

Няспыняючыяся бомбавыя замахі і арышты ў Харвацыі кажуць выразна, што ня ўсё ў гэтым шматпакутным краю так „ціха і лагодна", як прадстаўляе югаслаўская афіцыяльная прэса. Як ведама „каралеўска-фашыстаўскі пераварот", зроблены два гады назад, дарэшты скасаваў усялякую нават краёвую самастойнасьць Харвацыі (як і іншых самастойных земляў, існаваўшых нават пад нямецкай Аўстрыяй), парэзаўшы іх на нейкую „сечку" і ўсё гэта зьмяшаўшы ў адзіную, „аднародную"—Югаславію. Усе дзеячы і барацьбіты—ня толькі незалежнасьці, але нават краёвай самастойнасьці Харвацыі былі пасаджаны ў вастрогі. На іх месца, ведама-ж, знайшлося шмат „прыхільнікаў караля Аляксандра" і яго думкі аб стварэньні „адзінага народу" з трох „плямёнаў", злучаных у Вэрсалі ў—„Сэрба-Харвата-Славэнію". У выніку ўсей гэтай спрытнай працы сэрбскіх цэнтралістаў—нават гэты вэрсальскі назоў „злучанага каралеўства С. Х.-С." быў скасаваны, дый заменены афіцыяльным назовам — „Югаславія". Кароль з сваімі генэраламі прымае ўсьцяж найбольш жорсткія меры, каб ані водны крык ці стогн харвацкага народу ня вырваўся за граніцы кардон „Югаславіі". Але бясспынныя замахі дый новыя расправы кажуць ярка аб тым, што здаровыя імкненьні да краёвай і нацыянальнай самастойнасьці ўціснеых народаў „Югаславіі" не задушаны сэрбскім каралеўскім фашызмам, рыхтуючы яму, хіба-ж, шмат неспадзяванак...

Угода паміж Ганді і віцэ-каралём Індыі.

Паміж Ганді і найвышэйшым прадстаўніком англійскага ўлады ў Індыі дайшло да ўгоды, асноўныя пункты якой зводзяцца да наступнага:

1) дазволена дабываньне солі мясцоваму жыхарству, якое жыве на берагох мора і свабодная яе прадажа незалежна ад урадовага манаполю;

2) зварот маемасьці, якая была адабрана, дзякуючы адмове плаціць падаткі;

3) дазвол на ўстанаўленьне індускіх пастарункаў з мясцовай цывільнай люднасьці, якая мае права весьці агітацыю перад крамамі, каб ня куплялі загранічныя тавары.

4) Ганді адмаўляецца ад далейшага вядзеньня г. зв. акцыі „цывільнага непаслухмянства".

У бліжэйшых днях ангельская дэлегацыя выедзе ў Індыю ў мэтах сфіналізаваньня канфэрэнцыі „круглага стала".

Далей, як падаюць газэты, выканаўчы камітэт кангрэсу адначасна зацьвярдзіў умову, якая была зроблена між віцэ-каралём Індыі і Ганді.

Гэтыя ўсе факты маюць аграмадна палітычнае значэньне і сьведчаць аб упакаеньні сярод індускіх масаў.

Францыя.

У часе дыскусыі над ваенным бюджэтам Францыі высьветліліся цікаўныя даныя аб разьмерах мілітарызму—як у Францыі, так і ў іншых дзяржавах. Дакладчык бюджэту заявіў, што Францыя цяпер значна зьменшыла свае ваенныя сілы і выдаткі на армію, раўнуючы да... часу вайны. Амэрыка павялічыла выдаткі на армію на 86%, Японія—на 48%, а Францыя зьменшыла на 16%. Нямеччына мае 259 000 жаўнераў, тады як Францыя мае ўсяго толькі 270.000. Пасьля выступіў сацыяліст Шуфэ, які сказаў, што ўсё, што казаў дакладчык — хлусьня. Францыя выдае на ваенныя патрэбы 19 мільярдаў франкаў у год! Ваенны міністар паправіў: не 19, але 13. Але Шуфэ стаяў на сваім і даказаў, што апрача 13, яшчэ 6 мільярдаў ваенных выдаткаў разьнесены былі па бюджэтах іншых міністэрстваў, як гэта робіцца цяпер усімі дзяржавамі—дзеля паказаньня іх „пацыфічнасьці".

Морскае паразуменьне паміж Францыяй і Італіяй.

Англійскай дыплёматыі ўдалося дабіцца рашучага пасьпеху ў яе стараньнях спыніць выперадкі ў морскіх збраеньнях вялікіх дзяржаваў, за якімі ня можа ўжо ўгнанацца фінансава й гаспадарча занепаўшая Англія. Лёгка зразумець, што „зусім асабліваі дзяржаўнай будове" Англіі — яе раскінутай па ўсім сьвеце дзяржаўнай тэрыторыі сьмяротна пагражаюць гэтыя ўсьцяж узрастаючыя флёты іншых дзяржаваў.

Як ведама, на канфэрэнцыі ў Лёндане ў летку мін. году Мак-Дональду ўдалося дабіцца падпісаньня так зван. „Морскага трактату трох,— вялікіх морскіх дзяржаваў: Англіі, Амэрыкі й Японіі. Але — ані Францыя, ані Італія не далучыліся тады да трактату, адкінуўшы тыя „нормы" ці межы морскіх збраеньняў, якія накілулі ім гэтыя „камандзіры на акіянах".

Францыя заявіла, што сама сабе паставіць „нормы" для свайго флёту, кіруючыся патрэбамі свае дзяржавы, а не карысьцямі Англіі ці воляй Амэрыкі. А Італія заявіла, што хоча й будзе мець флёт — ня меншы, як Францыя. Ясна, якую небясьпеку гэта прадстаўляла для Англіі, толькі што адратаваўшай сябе ад забіўчай пагрозы канкурэнцыі ў збраеньнях з боку Амэрыкі і Японіі.

Трэба было за ўсялякую цану дабіцца паразуменьня з Францыяй й Італіяй, а пасьля і згоды абедзьвюх паміж сабой і да прылучэньня да супольнага трактату.

Гэндэрсон в. спрытна выкарыстаў усе небясьпекі для Францыі й Італіі іх узаемнай грызьні й канкурэнцыі ў морскіх збраеньнях.

Сутнасьць паразуменьня Францыі й Італіі — ў тым, што Італія адмаўляецца ад дамаганьня роўнасьці флёту свайго з французскім. За гэта Францыя і Англія даюць вялікую пазыку Італіі, а Францыя яшчэ ўдадатак абяцае пайсьці на значныя ўступкі Італіі ў яе дамаганьнях „перагляду стану валаданьня у Афрыцы" і — палажэньня італьянцаў у афрыканскіх калёніях Францыі.

З свайго боку Англія згадзілася на тое, каб Францыя мела стольві падводных лодак, сколькі вымагае ахова яе заморскіх калёніяў. Ня ведама толькі, ці згодзяцца на гэта апошняе Амэрыка й Японія.

Падпісаньне гэтага паразуменьня ў Рыме выклікала вялізарную радасьць у Францыі. Брыян і Гэндэрсон выслалі з Парыжу італьянскаму міністру тэлеграму, у якой захопліваюцца „ляяльнасьцяй і міратворчай палітыкай Італіі".

Значэньне морскага паразуменьня Італіі й Францыі, дый іх абедзьвюх з Англіяй вялізарнае.

Насамперш, яно вырашае, прынамся на бліжэйшыя гады, абмежаваньне збраеньняў на моры— у рамках ужо агульнага трактату вялікіх і сярэдніх морскіх дзяржаваў — „трактату пяцёх". А гэта ўжо значна падмуроўвае прышлую працу назначанай ужо на 1932 г. агульнай міжнароднай канфэрэнцыі ў справе разбраеньня на моры й на сушы.

Ня менш важным для агульнага палітычнага стану ў Эўропе зьяўляецца гэта паразуменьне таму, што яно, калі не касуе цалком, дык у кожным разе значна аслабляе той падзел Эўропы на два варожых лягеры: Францыю з яе — саюзьнікамі з аднаго боку, і Нямеччыну—Італію—ССРР з другога, — пры пэўнай „вольнасьці рухаў" з боку Англіі. А ведама, што якраз падобны стан так званай „эўрапейскай раўнавагі" й давёў да вайны... Пераход, хаця-б нават і частковы, Італіі на бок Францыі і Англіі, аднаўленьне быццам былой ваеннай „антанты" (паразуменьня) гэтых трох вялікіх дзяржаваў пазбаўляе важнага „саюзьніка" — і Нямеччыну й ССРР...

А гэта, зразумела, значна аслабляе наагул увесь фронт так званых „рэвізіяністаў", ці праціўнікаў Вэрсальскага Трактату й ладу ў Эўропе..

Таму, як і можна было спадзявацца, франка-італьянскае паразуменьне выклікала вялікае незадаволеньне ў Нямеччыне, прэса якой даводзіць, што паразуменьне адбылося „коштам Нямеччыны", а ў маскоўскіх колах, дык выклікала проста шалёнае абурэньне: маскоўская прэса піша, што ўсё паразуменьне мае адзіную мэту: падрыхтоўку вайны проці радаў...

З жыцьця Савецкай Беларусі.

Антырэлігійная акцыя ў школах.

Па распараджэньню Камісарыяту Асьветы на ўсім абшары Савецкай Беларусі вядзецца проці-рэлігійная акцыя.

Камун. ўлада асаблівую ўвагу зьвяртае на школы, дзе ўведзена асобная навука „антырэлігія". На гэтых „лекцыях" дзеці дэмаралізуюцца ў адпаведны спосаб і гэта лічыцца выхаваньнем па новаму, Савецкаму спосабу.

Дзяцей прымушаюць распрацоўваць тэмы з проці-рэлігійным зьместам і г. д.

Адным словам відаць з усяго, што гэтая справа ў Саветах стаіць вельмі добра.

Каб там гэтак-жа добра стаялі і іншыя справы, як, напрыклад, справа з апровізацыяй гарадзкога насельніцтва, калектывізацыей вёскі і т. п.— то запраўды было-б чым пахваліцца перад „добрымі людзьмі". Але, нажаль для камуністаў, яны толькі здольны да разбураючай працы, да нішчэньня нацыянальных культураў і вечнай барацьбы з рознымі ворагамі.

Далей гэтага „сацыялістычнае будоўніцтва" не пайшло і не пайдзе — такі ужо відаць лёс камуністычнае дыктатуры.

Кароткія навіны.

— Львоўскі суд прысудзіў павадыроў украінск. партыі „Сель-Роб.": б. сэнатара Хінчыца на 5 гад. катаргі, б. пасла Путка—на 1 год катаргі; рэшту падсудных—на пабыт у вастрозе ад 7 мес. да 3 гадоў. Трэба адзначыць, што ў Галічыне дзее суд прысяжных, ня так, як у нас. Але, як бачым, прысуды роўна жорсткія.

— Ня прызнаўшы загаду Маскоўскага Патрыяршага Сыноду, мітрап. эміграцкіх цэркваў Яўлогі не аддаў улады мітрап. Еляўфэрыю, але паехаў зараз-жа ў Канстантынопаль да патрыярха і атрымаў ужо ад яго назначэньне сябе „экзархам" апошняга — з беспасрэднім падпарадкаваньнем сваёй мітраполіі яго найвышэйшай уладзе.

Такім чынам уся заходня эўрапэйская праваслаўная мітраполія паддалася, замест Маскоўскай, Канстантынопальскай патрыярхіі, падобна, як праваслаўная „аўтокэфальная" царква ў Польшчы.

— 32 патрыятычных арганізацыяў у Злучаных Штатах Амэрыкі патрэбавалі, каб прэз. Хувэр забараніў усялякі гандаль з ССРР, у якім улады — пры прадукцыі тавараў — карыстаюцца ўсьцяж нявольніцкай працай.

Таксама амэрыканская Фэдэрацыя Працы (Аб'яднаньне работніцкіх праф. саюзаў) трэбуе ад Хувэра поўнай забароны ўвозу радавых тавараў — „дзеля меркаваньняў і маральных і гаспадарчых".

— З Масквы выслана ў Бэрлін трэцьцяя ўжо найвялікшая партыя золата — ў 8.000 кілягграм.

Вялікаа група найбуйнейшых нямецкіх прамысловцаў выехала 26 лютага ў Маскву—ў зьвязку, відаць, з аднаўленьнем гандлёвай умовы і далейшай разбудовай гаспадарчага супрацоўніцтва абедзьвюх краінаў.

— Памёр адзін з выдатнейшых правадыроў П. П. С., пасол Діамант, ведамы спэцыяліст фінансава-гаспадарчых справаў. Трэба адцеміць, што нябошчык, жыд з крыві й веры, адзначаўся рэзка і ярка ахварбаваным польскім нацыяналізмам, нягорш сумленнага эндэка. Гэта-ж ён найбольш з усіх іншых польскіх „нацыянал-сацыялістаў" ахварбоваў партыю ў яе яркія „калёры", выступаючы вастрэй за ўсіх сваіх таварышоў проці меншасьцяў.

— Сталін усьцяж дабівае сваіх найвыдатнейшых старых правадыроў камунізму. Звольнены толькі што й стары „патрыярх" камунізму Рязанаў, дырэктар „Інстытуту Маркса і Энгельса". Гэты інстытут быў арганізаваны самім Рязанавым, каштаваў вялізарных грошаў і разглядаўся, як запраўдны „храм" дзеля рэлігійнага культу гэтых абодвух закладчыкаў рэвалюцыйнага сацыялізму, а сам Рязанаў, як „вярхоўны жрэц" гэтага храму. А вось, Сталін узяў дый адным махам выкінуў гэтага жраца з яго храму.

— 23 лютага ў ССРР урачыста й ваяўніча сьвяткаваліся 13 тыя ўгодкі закладзінаў чырвонай арміі. Угодкі ператкарыліся ў вялізарную маніфэстацыю так званай „мітратворчай палітыкі радаў" і — ў дэманстрацыю проці „ўсьцяж рыхтуючага вайну проці Радаў" усяго капіталістычнага сьвету. У выніку — новы заклік да „працоўных масаў ССРР быць гатовымі да накіданай ім вайны", не шкадаваць ні грошаў, ні працы на збраеньне...

гаспадарка расьце, але рост яе моцна адстае ад тэмпу росту насельніцтва і росту патрэбаў краю" (стар, 35).

Рыкаў змушаны быў сілай фактаў прызнаць тыя вынікі, якіх дабілася кампартыя на вёсцы, дзякуючы сваёй карыснай працы.

Такім чынам, выходзіць, што савецкая сельская гаспадарка наперш не дасягнула яшчэ ў многіх галінах нават даваеннага роўню, і па другое—той рост, які ў ім назіраецца — не пасьпевае за ростам насельніцтва.

У гэтым уся трагэдыя камуністычнай дыктатуры ў Саветах,—трагэдыя, каторая нямінуча павінна закончыцца разьвязкай, якую ня цяжка прадбачыць.

Уяўляючы катастрафальнае палажэньне ў сельскай гаспадарцы, Савецкая ўлада змушана была звярнуцца да цэлага раду вострых мераў па масавай колектывізацыі, закончыўшыхся запанаваньнем поўнага хаосу ў сельскай гаспадарцы і да новага ўціску „кулацкіх" гаспадарак, каб выціснуць з іх тыя спажыўчыя запасы, без якіх дыктатура гарадзкога гэгэмона аказалася-бы вельмі проблематычнай.

„Мы павінны — кажа Рыкаў, — напамінаючы пастановы 15 зьезду кампартыі аб працы на вёсцы: „карыстаючыся ўсей магутнасьцю гаспадарчых ворганаў, і як перш, апіраючыся на сярэдняцка-бедняцкія масы селянства, разьвіць справу наступленьня на кулацтва і прыняць рад новых мераў, абмяжовываючых разьвіцьцё капіталізму на вёсцы і вядучых сельскія гаспадаркі па дарозе да сацыялізму". (Ibid стр. 53).

Гэты новы паход на „кулацтва", (пад катотым трэба разумець звычайнага працаўніка-селяніна таму, што за гады камуністычнага ўладаньня ад запраўдных даваенных кулакоў асталіся толькі адны ўспаміны),—кампартыя на чале са Сталіным павяла з новай сілай.

(Далей будзе).

Дзе сорам і сумленьне?

Беларускі Цэнтрасаюз разаслаў нядаўна заклік да сьвядомай часткі беларускага грамадзянства, каб памагла ў справе арганізацыі бібліятэк-чытальняў. У ім гаварылася аб тым, што Цэнтрасаюз у першую чаргу адчыніць некалькі бібліятэчак у тых пунктах, дзе будуць адпаведныя ўмовы: бясплатнае памяшчэньне і г. д.

Гаварылася і пра лекцыі, але нідзе, між іншым, не ўспаміналася пра тое, што будзе аплачвацца памяшчэньне, вызначанае пад лекцыі, бо на гэта Цэнтрасаюз ня мае ніякіх сьродкаў.

І вось знайшоўся нейкі „самастойнік" са Стаўпецкага павету, які, перакручваючы факты, сьведама ўводзіць у блуд нашае грамадзянства.

Гаворыць, напрыклад, што быццам Цэнтрасаюз абяцаў плату ня толькі бібліятэкаром, але нават за памяшчэньне, дзе прачытаецца пабеларуску лекцыя. Добра было б, каб Цэнтрасаюз мог аплаціць усё гэта, але на жаль ня мае сьродкаў.

У далейшых сваіх разважаньнях „самастойнік" бачыць у намерах Цэнтрасаюзу адчыняць бібліятэкі-чытальні нейкую пасьмешку над беларусамі Стаўпецкага павету і жаданьне замкнуць „разьвіцьцё беларускай культуры ў сваю крамку санацыйнай палітыкі".

Вось і шукай тут лёгікі ў нашых „самастойнікаў!

Трэба мець запраўды медны лоб, каб у факце адчыненьня звычайнай беларускай бібліятэкі бачыць небясьпеку для беларускай культуры, тым балей у тых месцах, дзе ніколі ня было такой бібліятэкі і няма нават надзеі, што яе арганізуюць такія дзеячы, як стаўпецкі самастойнік, напісьваючы свае бязглудзіцы, якія вельмі ахвотна зьмяшчае „Беларуская Крыніца".

— У Маскве — ў гмах польскага пасольства забраўся—ў часе пабыту ў Варшаве пасла—нейкі дзіўны „злодзей". Ня ўзяўшы ані воднай з раскіненых у кватэры пасла каштоўнасьцяў, ён сіліўся ўсьцяж толькі адчыніць даскавала дабраным ужо загары ключом дзьверы ў габінэт пасла, дзе хаваліся розныя „цікаўныя" для гэтага... звычайнага злодзея паперы й дакумэнты... Шкада толькі, што ўсунуў ключ ня ў тыя дзьверы, дый яшчэ выцягнуць яго назад ня мог. Тут яго за „працай" і засталі. Польскі ўрад зьвярнуўся з вострай нотай да радавага, каб той вытлумачыў увесь „выпадак". Радавы ўрад даў ужо адказ, толькі ён яшчэ не апублікаваны.

— У Галацы (Румынія) ўзарваны гмах ваеннага суда. Гмах зруйнаваны цалком. Выбух адбыўся тады, калі ў судзе сядзеў толькі яго сэкрэтар. Бомбу быццам падлажылі тры арыштанты—расейцы, якія працавалі пры рэпарацыі гмаху. — Бомба быццам была з гадзіньнікам, які быў настаўлены на час, калі ў гмаху засядаў увесь склад суда.

Так пішуць румынскія газэты.

— За ўплывы ў Афганістане ідзе ўсьцяж барацьба паміж Англіяй й Радамі. Толькі што Англія пазычыла новаму афганскаму каралю 600.000 даляр. і „падаравала" (?) 10.000 карабінаў.

— На прэзыдэнта вострава Кубы зроблены два замахі ў працягу 2 дзён. Апошні раз — у часе яго прамовы ў Капітолі — нейкі рэвалюцыянэр стрэліў у прэз. з рэвальвэру. Пасьля арыштаваньня замахоўца прэзыдэнт спакойна скончыў прамову: драбяза, звычайнае здарэньне!...

Хроніка.

— **„Адказ" Тарашкевіча на адкрытае пісьмо.** У № 42 „Савецкае Беларусі" з 20 лютага 1931 г. зьявілася „пісьмо" з подпісам „Б. Тарашкевіч", у якім гр. Тарашкевіч нібы то дае адказ на адкрытае пісьмо да яго грам. Луцкевіча, Астроўскага і інш. у справе выпушчаных камуністычнай партыяй у часе выбарнае кампаніі агідных, ілжывых лятучак з подпісам б. павадыра „Грамады". Аўтары адкрытага пісьма ў канцы лістапада (ці ў пачатку сьнежня?) мінулага году публічна зьвярнуліся да гр. Тарашкевіча з запытаньнем: ці запраўды ён пісаў тыя лятучкі, і заявілі, што будуць чакаць на яго адказ безпасярэдня пісьмом да 1 студня 1931 г. На гэтае пісьмо Тарашкевіч нічога не адказаў. Але вось цяпер, калі — дзякуючы камуністычнай правакацыі — Тарашкевіч апынуўся ізноў у вастрозе ў Польшчы, „Савецкая Беларусь" надрукавала ягоны „адказ", якога

Трэба быць асьцярожным.

Газэты падаюць, што ў Лідзе арыштавана цэлая шайка ашуканцаў, якая займалася асобага роду кражамі.

Зьбіраліся залатыя „царскія" манэты пераважна пяці і дзесяцірублёўкі, адсылаліся у м. Роўна ў „фабрыку", дзе з іх здымалася частка золата і потым гэтыя манэты, якія трацілі на сваёй вартасьці да 15% — зноў пушчаліся ў абег.

Як падаюць газэты— амаль 80% залатых манэтаў „перароблены" ў такі спосаб, дзеля чаго іх прымаюць цяпер у банках толькі на вагу.

Шайка ашуканцаў якая складаецца з некалькі чалавек—Шлёмы Тэнэнбаўма, Нахмана, Янкеля Гровэра і іншых — пасаджана ў Лідзкі вастрог, але тэй шкоды, якую яна прынясла насельніцтву ня верне.

Дзякуючы „працы" гэтай кумпаніі, пяцірублёўка расьцэньваецца цяпер толькі ў 18—10 залатовак.

Тарашкевіч, ясна-ж, ня мог ня толькі пісаць, але й бачыць. „Адказ" прызнае Тарашкевіча аўтарам гэных агідных лятучак, але разам з тым выдае запраўдных аўтараў гэтага „адказу": бо-ж Тарашкевіч, найвыдатнейшы беларускі філёлёг і аўтар беларускае граматыкі, ня мог рабіць памылак, якіх вучань трэцяе клясы беларускае гімназіі ўжо ня робіць. А ў „адказе" знаходзім усьцяж такія выражэньні, як чыста польскі зварот „на Заходняй Беларусі", як „удзельнічаюць", „садзейнічаюць" і г. д.

Машэнскія прыёмы камуністычнае партыі ведамы ўжо даўно. „Адказ" чалавека, які сядзіць за кратамі і ня можа бачыцца нават з сваімі найбліжэйшымі, не ашукае нікога!

— **„Жаноцкая Справа".** На мінулым тыдні выйшаў з друку журнал „Жаноцкая Справа". Рэдактарка журнала гр. Н. Шнаркевічыха; Выдавец—Аб'яднаньне Беларускіх Жанчын імя Цёткі.

Зьмест журналу вельмі багаты і ўдала падабраны—закратваючы шмат балючых бакоў беларускага народу наагул, а бел. жанчыны ў асаблівасьці. журнал напісаны папулярна — зразумела для нашае вёскі. Есьць шмат цэнных радаў і парадаў для гаспадыні. Пажадаем Найлепшага росквіту „Жаноцкай Справе" ў яго служэньні беларускай працоўнай жанчыне.

— **Кніга аб партызанскім руху на Беларусі.** У канцы мінулага 1930 г. выйшлі з друку ў Празе Чэскай успаміны атамана беларускіх партызанаў В. Разумовіча-Хмары пад назовам „Grimasy svetove války" („Жудасьці сусьветнай вайны"). Кніга напісана пачэску і мае 248 старонак. У канцы пададзены сьпіс дакумэнтаў, здадзеных у Праскі Расейскі Архіў з часоў партызанскага руху ў 1920—25 годзе. Па дайшоўшых вестках, кніга-успаміны ўжо пераложана на нямецкую мову да друку. Зьмест досыць разнавідны і перадусім датычыць партызанскага руху на Беларусі. Аўтар, не шкадуючы хварбаў, малюе палажэньне беларускіх стральцоў у Ліцьве і іх ролю ў Заходняй Беларусі.

Кніга-ўспаміны свайго роду дакумэнт нясумленнага адносаньня літоўскіх урадаў да Беларусаў. Разам з гэтым аўтар выразна малюе „ўзмацненьне палякоў у заваяваных крэсах усходніх", раскрывае закулісвую палітыку і працу ўраду Бел. Народнай Рэспублікі, ролю бальшавіцкіх эмісараў, ды шмат іншых мамэнтаў. У будучыне вернемся да падрабнейшага агляду. Кніжка выдадзена добра, аздоблена арыгінальным малюнкам і партрэтам аўтара атамана Хмары. Каштуе 28 карон чэскіх.

— **Суд над выдаўцом „Бел. Крыніцы" ў... Віленскім Унівэрсытэце.** 19 лютага г. г. ў галоўным будынку Віленскага Унівэрсытэту прафэсарскі Акадэміцкі Суд разглядаў справу выдаўца „Бел. Крыніцы", студэнта Янкі Шутовіча, які абвінавачываўся ў тым, што зламаў ганаровае забавязаньне, а гэтым самым спляміў чэсьць студэнта. Дзеялася гэта ў часе апошніх выбараў. Паводле ўспомненага забавязаньня, новы выдавец Шутовіч і адказны рэдактар Пазьняк ня мелі права выступаць у „Крыніцы" супроць зрокшагася старога выдаўца А. Стэповіча. Аднак, кіраўніцтва хадэцкага органу, будучы пэўнай у поўнай бяскарнасьці, наперакор выданаму на пісьме забавязаньню, зьмясьціла цэлы рад нападаў на былога пасла Стэповіча.

Акадэміцкі Суд, зложаны з 5 прафэсараў, пад старшынствам праф. Gläsera, пасьля трохгадзіннага засяданьня, прызнаў Шутовіча вінаватым зламаньня забавязаньня і вызначыў дысцыплінарную кару.

Такім чынам, аўторытэтны і бесстаронны прафэсарскі суд лішні раз пацьвярдзіў маральны ўпадак некаторых верхаводаў бел. хадэцыі.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Шкоднае для царквы кіраўніцтва Віленскае Япархіяльнае ўлады выклікала ў пачатку 1930 г. утварэньне Праваслаўнага Беларускага Камітэту. Зараз-жа па яго ўтварэньні старшыня і яго сябры пачалі абліваццa ў кансысторскай газэце „Наша Жизнь" брудам. Гэту газэту Кансысторыя рассылала духавенству, прымусова спаганяючы праз яго грамадзкія грошы.

Такая дзеяльнасьць Кансысторыі пазбавіла магчымасьці супрацоўніцтва з ёю і аканчальна выявіла воблік яе сяброў. Вынікам такога захаваньня Кансысторыі быў выпуск няведамымі Камітэту асобамі аднаднёвак, выпуск якіх сьвяшчэньнік А. Коўш публічна асудзіў у прэсе. Пасьля сябры Кансыторыі шмат разоў падсылалі да мяне сваіх людзей дзеля наладжаньня згоды. Шчыра жадаючы гэтае згоды, я працаваў у гэтым напрамку.

Напрукаванае ў № 38 „Dziennika Wileńskiego" пісьмо трох прат.—Дзічкоўскага, Кушнёва і Бяляева аб аўтарстве аднаднёвак пераконвае мяне, што прапануючы згоду, гэтыя людзі выявілі крывадушша, фальш і правакацыю, чаму найлепшым доказам служыць наступная выпіска з атрыманага мной пісьма аднаго пратаярэя: „Улетку 1930 г. з мэтаю дыскрэдытаваць Вас прат. Кушнёў намаўляў мяне напісаць яму, або Кансысторыі, быццам Вы з сьвяшч. А. Коўшам выдалі аднаднёўку „Проч з ліхазельлем", абяцаючы мне за гэта найлепшы прыход у япархіі, і пагражаючы ў выпадку мае адмовы—мне карамі. Вось гэты факт прыпомніўся мне цяпер і высоўвае пытаньне, ці не правакуюць Вас гэтыя асобы, як хацелі справакаваць раней праз мяне".

З гэтага пісьма відаць, што правакацыя проціў мяне падрыхтоўвалася яшчэ ў 1930 г. Пісьмо трох прат. лічу правакацыяй, бо быўшыя ў Кіршэўскага іншыя асобы катэгарычна пярэчаць, каб я гаварыў аб удзеле сьвяшч. А. Каўша ў аднаднёўках. Такая крывадушная дзейнасьць паасобных сяброў Кансысторыі і іх аднадумцаў служыць найяскраўшым доказам, што з імі немагчыма ніякая згода, і Камітэт павядзе з імі самую рашучую барацьбу.

З пашанай **Т. Вярніноўскі.**

Усячына.

Моторызацыя сьвету.

Паводле апошніх статыстычных дадзеных складзеных больш менш да паловы мінулага году на ўсім сьвеце ў руху находзіцца 29 мільёнаў лёгкіх самаходаў і 5,2 мільёнаў самаходаў грузавых. Пад канец мінулага году гэтыя лічбы ўзятыя закругліліся напэўна да 35 мільёнаў.

З гэтае лічбы ў Паўночнай Амэрыцы знаходзіцца 26.5 мільёнаў, ці 75%, у Канадзе каля 1,2 мільёну. Разам на абшары Паўночнай Амэрыкі ёсьць 27,7 мільёнаў самаходаў, ці 80% агульнасусьветнае колькасьці.

У Эўропе ў руху знаходзіцца 4,7 мільёнаў самаходаў, што больш-менш выходзіць каля 13%. На паасобныя дзяржавы прыходзіцца:

Англія	1,447	тысячаў
Францыя . . .	1,296	„
Нямеччына . . .	659	„
Італія	241	„
Гішпанія . . .	178	„
Бэльгія	143	„
Швецыя	136	„
Голяндыя	112	„
Данія	101	„
Швайцарыя . . .	70	„
Чэхаславацыя . .	58	„
Ірляндыя	43	„
Нарвэгія	42	„
Аўстрыя	38	„
Польшча	37	„
Фінляндыя . . .	36	„
Румынія	36	„

Найбольшым вытворцам самаходаў па Амэрыцы ёсьць Францыя, якая ў сваіх шматлікіх фабрыках вытварыла 246 000 самаходаў. Другое мейсца па Францыі, а трэцяе ў сьвеце займае Англія, якая ў мінулым годзе вытварыла 239 000 самаходаў.

Радактр-выдавец: **М. Сіняўскі**

Друкарня Я. ЛЕВІНА Вільня, Нямецкая 22.